INTERNATIONAL BACCALAUREATE
BACCALAURÉAT INTERNATIONAL
BACHILLERATO INTERNACIONAL



**BELARUSSIAN A1 – STANDARD LEVEL – PAPER 1**
**BIÉLORUSSE A1 – NIVEAU MOYEN – ÉPREUVE 1**
**BIELORRUSO A1 – NIVEL MEDIO – PRUEBA 1**

Monday 8 May 2000 (morning)
Lundi 8 mai 2000 (matin)
Lunes 8 de mayo del 2000 (mañana)

3 hours / 3 heures / 3 horas

---

INSTRUCTIONS TO CANDIDATES

- Do not open this examination paper until instructed to do so.
- Section A: Write a commentary on one passage. Include in your commentary answers to all the questions set.
- Section B: Answer one essay question. Refer mainly to works studied in Part 3 (Groups of Works); references to other works are permissible but must not form the main body of your answer.

INSTRUCTIONS DESTINÉES AUX CANDIDATS

- Ne pas ouvrir cette épreuve avant d'y être autorisé.
- Section A : Écrire un commentaire sur un passage. Votre commentaire doit traiter toutes les questions posées.
- Section B : Traiter un sujet de composition. Se référer principalement aux œuvres étudiées dans la troisième partie (Groupes d'œuvres) ; les références à d'autres œuvres sont permises mais ne doivent pas constituer l'essentiel de la réponse.

INSTRUCCIONES PARA LOS ALUMNOS

- No abra esta prueba hasta que se lo autoricen.
- Sección A: Escriba un comentario sobre uno de los fragmentos. Debe incluir en su comentario respuestas a todas las preguntas de orientación.
- Sección B: Elija un tema de redacción. Su respuesta debe centrarse principalmente en las obras estudiadas para la Parte 3 (Grupos de obras); se permiten referencias a otras obras siempre que no formen la parte principal de la respuesta.

## ЧАСТКА А

*Напішыце каментарый да аднаго з наступных тэкстаў:*

**1.** (a)

Ён пазнаёміўся з ёй месяц таму , вясной. Быў канец красавіка.Яны выпадкова сустрэліся за горадам , на аўтобусным прыпынку. Ішоў дождж. Яна была тады мокрая , непрыгожая , але вось нечым спадабалася .Дарэчы , яна ўвогуле не прыгажуня : пасівелыя валасы ( а ёй жа ўсяго дваццаць шэсць !), вочы бляклыя , быццам заплаканыя. А калі яна першы раз перад ім распранулася , дык ён зніякавеў – скура белая, як у прывіда, ды яшчэ глыбокі шнар на руцэ ў выглядзе нейкай літары… Але фігура ў яе нішто сабе. Усё ж такі падабаецца яна яму!..

…Яшчэ дзіўна ў ёй тое, што надта часта згадвае пра свайго былога сябра. Ведаем мы гэтых “сяброў”…Але ж гаворыць, нібыта сябар памёр, калі яму было толькі дваццаць шэсць, як ёй зараз. Памёр ад сардэчнага прыступу. З-за таго і дарує ён размовы пра гэтага сябра: відаць, як той памёр, дык у яе з галавой нешта і здарылася…Ну дык ён жа чалавек разумны, ведае, якія жанчыны ўсе слабыя, таму і дарує…

– Дождж можна ўбачыць толькі праз акно, паўтарыла яна, счакаўшы колькі хвілін. Бо калі выйсці на вуліцу, бачна яго ўжо не будзе. Будзеш адчуваць дождж, а каб яшчэ і ўбачыць яго, цябе проста не хопіць на тое…Але сапраўдны дождж ідзе ў душы…Ён так казаў.

Хто?

Але яна не адказала. Ён не стаў перапытваць, бо ведаў: зараз яна магла гаварыць толькі пра свайго сябра.

Я пайду, пагуляю трошкі.

Дык дождж жа?

Заўсёды дождж…

І яна пайшла.

Больш ён яе не бачыў. Не ведаў нават, ці жывая. Аднойчы да яго ў рукі выпадкова трапіў нейкі раман, які заканчваўся гэткімі радкамі:“Дождж можна ўбачыць толькі праз акно, бо калі выйсці на вуліцу, бачна яго ўжо не будзе. Але сапраўдны дождж ідзе ў душы”. Потым ён адгарнуў першую старонку, прачытаў сціплыя радкі прысвячэння – раман быў прысвечаны ёй…

Пасля гэтага выпадку ён цалкам змяніўся. Сябры яго не пазнавалі: ён нібы звар’ яцеў. Хацелі нават да псіхіятра весці, але потым нехта сказаў, што такое робіцца з кожным, хто да яе дакранаецца, і што дапамагчы яму ўжо немагчыма. Спачатку гэта гучала дзіўна, але потым сябры пагадзіліся і адчапіліся ад яго. На працу ён перастаў прыходзіць, і нават цяжка было высветліць, ці з’ехаў ён з кватэры, ці проста нікуды з яе не выходзіць. Суседзі казалі, быццам ён спіўся. Яшчэ бачылі, як ён гуляў пад дажджом без парасона – зразумела, дурны…

…Так цягнулася колькі месяцаў. Потым ён знік. Знік назаўсёды, ніхто яго болей не сустракаў. Толькі адна бабулька бачыла, як аднойчы пайшоў гуляць у дождж. На вуліцы больш нікога не было – вядома, усе нармальныя людзі ў дождж дома сядзяць. Але раптам аднекуль з’явілася дзяўчына, таксама без парасона і

капелюша, мокрая і збялелая. Падбегла да яго, сказала нешта, схапіла за руку, і яны зніклі…

Яны стаялі ад мяне так блізка, што чуваць было, аб чым яна гаварыла. А потым раптам нібыта расталі, як і не было іх,   расказвала старая.

А што ж яна сказала яму?

Ды лухту нейкую…Я нічога і не ўцяміла, толькі чамусьці запомніла добра. Здаецца, так казала:“ Ты ж ведаеш, што так дождж нельга ўбачыць. Толькі адчуць. Але сапраўдны дождж ідзе ў душы. Як у цябе зараз. Ну, цяпер ты зразумеў мяне? Дык пойдзем, я пазнаёмлю цябе з маім сябрам…” Здаецца, так яна казала…

І больш нічога?

Яшчэ колькі слоў дадала, толькі быццам і не да яго звярталася, а і да мяне таксама. Як цяпер чую:“ Дождж ідзе заўсёды. Ён будзеісці, пакуль не загіне апошні чалавек. Дождж. Гэта мае слёзы. Я плачу па чалавецтве. І па табе – таксама”.

…І па табе – таксама.

Наталл Ўласава. *Дождж* (1999)

– Як паказваюцца адносіны паміж юнаком і дзяўчынай?

– Разгледзьце як змяняюцца адносіны галоўнага героя да жыцця.  Як гэта перадаецца ў апавяданні?

– Як паўтарэнне слова дождж адбіваецца на агульным сэнсе апавядання?

– Якімі вобразнымі сродкамі карыстаецца аўтар, каб перадаць змены ў стане душы галоўнага героя?

**1.** (b)

## КРЫЛЫ

Прыпомнілася, калі летаў птушкай
Ад зоркі і да зоркі за табой,
Прасіла ты: "Хоць трошачкі пагушкай
І дакраніся да губы губой".

Ляцелі мы. Усё вышэй ляцелі,
А Млечны Шлях сузор'і замялі.
Былі мы ў белым пер'і і хацелі
Прыпасці да блакітнае Зямлі.

Пад пер'ем сэрцы соладка трымцелі,
І мы сябе адолець не змаглі:
Буяла кроў у акрыялым целе,
Калі знайшлі мы радасць на Зямлі.

На нас Венера з вышыні глядзела,
Ты прашаптала : "Крылы не зламі",
Пакуль мы спалі, пер'е абляцела,
І сталі мы бяскрылымі людзьмі.

Адразу здаўся Млечны Шлях кароткім,
Мы навучыліся смяяцца і маўчаць,
Зайздросціць: быццам нашы продкі,
У неба ў пары лебедзі ляцяць.

Сяргей Грахоўскі, *Крылы* (1997)

– Разгледзьце адпаведнасць назвы верша яго зместу?

– У чым значэнне спасылак на неабсяжнасць сусвету і іншыя планеты ў кантэксце верша?

– Звяртаючыся да зместу верша і цытуючы, дзе патрэбна, растлумачце прыроду пачуццяў, выражаных у вершы.

– Якія вобразныя сродкі ўжываюцца аўтарам, каб перадаць узнёсласць пачуццяў, выражаных у вершы?

## ЧАСТКА Б

*Напішыце эсэ на* ***адну*** *з наступных тэм. Вы павінны заснаваць свой адказ, сама меней, на двух творах Часткі 3, якія вы вывучалі. Спасылкі на другія творы дазваляюцца, але яны не павінны займаць галоўнае месца ў вашым адказе.*

**2.** Разгледзьце ролю, якую настальгія па мінуламу альбо мары пра будычыню іграюць у творах, якія вы вывучалі.

**3.** Параўнайце функцыю негатыўных (“дрэнных”) герояў у творах, якія вы вывучалі.

**4.** Разгледзьце ролю, якая адводзіцца канфлікту ў творах, якія вы вывучалі.

**5.** Некаторыя аўтары лічаць сябе “настаўнікамі”, а сваі творы –“ўрокамі”. У якой ступені можна лічыць “урокамі” творы, якія вы вывучалі?

**6.** Спасылаючыся на два ці болей творы, якія вы вывучалі, параўнайце як паказваецца атмасфера і месца дзеяння ў гэтых творах.

---